

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынская базавая школа”**

Выпуск №5 (30)
Студзень 2023

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **2023 год аб’яўлены Годам міру і стварэння** | **Стар. 1** |
| **Адбылося раённае навагодняе піянерскае свята** | **Стар. 2** |
| **Раённае навагодняе патрыятычнае мерапрыемства** | **Стар. 3** |
| **Акцыя “Ад усёй душы”** | **Стар. 4** |
| **ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна** | **Стар. 4** |
| **Навіны пачатковай школы** | **Стар. 5** |
| **Шосты школьны дзень** | **Стар. 6** |

# 2023 год аб’яўлены Годам міру і стварэння

У мэтах кансалідацыі беларускага народа, умацавання ў грамадстве ідэй міру і стваральнай працы як галоўных умоў развіцця беларускай дзяржавы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 2023 год аб'яўлены Годам міру і стварэння. Адпаведны Указ нумар 1 ад 1 студзеня 2023 года падпісаў Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Ключавымі накірункамі ў наступным годзе будуць удасканаленне сістэмы ваенна-патрыятычнага выхавання насельніцтва, прасоўванне мірных ініцыятыў грамадзян і грамадскасці, садзейнічанне міжканфесійнаму дыялогу, які забяспечвае мір і згоду ў беларускім грамадстве, дэманстрацыя пераваг беларускай эканамічнай мадэлі ва ўмовах глабальнай турбулентнасці, пазіцыянаванне стваральнай працы як галоўнай умовы развіцця беларускай дзяржавы.

# Адбылося раённае навагодняе піянерскае свята

4 студзеня Фурс Ксенія, вучаніца 5 класа, і Гурло Вячаслаў, вучань 6 класа, прынялі ўдзел у раённым навагоднім піянерскім мерапрыемстве.

Перад пачаткам свята дзеці наведалі навагоднія фотазоны і аквагрым, цікавыя майстар-класы.






Рабяты пад час мерапрыемства вадзілі дружныя карагоды, адгадвалі загадкі, танцавалі, праходзілі навагодні квэст, каб сустрэцца з Дзедам Марозам.

Усе ўдзельнікі атрымалі салодкія падарункі і зарад выдатнага настрою!!!





# Раённае навагодняе патрыятычнае мерапрыемства



5 студзеня Яўсеенка Захар, вучань 8 класа, прыняў удзел у раённым патрыятычным навагоднім свяце.

Прыемным сюрпрызам для Захара стаў не толькі салодкі навагодні падарунак, але і грамата ад упраўлення па адукацыі, спорце і турызме Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта!!!

Віншуем Захара і жадаем яму не спыняцца на дасягнутым!!!







# Акцыя “Ад усёй душы”

У рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі для пажылых людзей "Ад усёй душы" вучні 5 класа наведалі ветэрана педагагічнай працы Сіняўскую Эмілію Мікалаеўну.

Дзеці павіншавалі Эму Мікалаеўну з Новым годам, пажадалі ёй моцнага здароўя, дабрабыту і клопату з боку родных і блізкіх людзей. А затым дапамаглі прыбраць снег з двара і расчысцілі сцяжынкі.







# ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна

26 студзеня для вучняў 8-9 класаў прайшло мерапрыемства, прысвечанае інфармацыйна-адукацыйнаму праекту "ШАГ" - "Школа Актыўнага Грамадзяніна", на тэму "Гонар за Беларусь. Навука і інавацыі - сучаснасць і будучыня нашай эканомікі".

Вучні пазнаёміліся з дасягненнямі беларускіх вучоных, магчымасцямі для самарэалізацыі моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, нацыянальным дзіцячым тэхнапаркам. Абмеркавалі шэраг пытанняў па гэтай тэме і зрабілі вывад аб тым, што наша краіна не ўступае сусветнай навуцы і кожны павінен імкнуцца спазнаваць навакольны свет, пашыраць свой кругагляд, каб у будучым прыносіць карысць сваёй Радзіме.

Школа Активного Гражданина





# Навіны пачатковай школы

13 студзеня вучні 1-4 класаў наведалі спектакль "Навагодні сюрпрыз" у Дзяржынскім ГДК. Прадстаўленне ўсім прыйшлося да спадобы, усе прысутныя атрымалі зарад добрага настрою.






Пасля навагодняга спектакля школьнікі адправіліся ў эколага-біялагічны цэнтр, дзе іх чакала знаёмства з прадстаўнікамі жывёльнага свету, конкурсы і віктарыны.









# Шосты школьны дзень




14 студзеня ў рамках шостага школьнага дня вучні 1-9 класаў прынялі ўдзел у Калядках.

Добры эмацыянальны настрой быў на працягу ўсяго мерапрыемства. Рабяты выканалі калядныя песні і заклічкі, услаўляючы Каляду. Былі вясёлыя конкурсы. Ва ўсіх удзельнікаў Калядак засталіся толькі станоўчыя эмоцыі аб праведзеным свяце.

У канцы мерапрыемства ўсіх прысутных чакаў салодкі пачастунак.













Галоўны рэдактар – Ярашэвіч Мар’яна, вучаніца 8 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 28 лютага.
Тыраж – 15 нумароў. Кошт – 1 руб.